# Будучыня **мае сваю** гісторыю

**Выстава "Таленты Беларусі" прадстаўляе працы маладых майстроў за апошнія пятнаццаць гадоў**

У мінскай галерэі "Універсітэт культуры" экспануюцца лепшыя творы ыаладых мастакоў, скульптараў, фатографаў. Гэта работы выхаванцаў мастацкіх школ і сярэдне-спецыяльных навучальных устаноў, студэнтаў і выпускнікоў Беларускай дзяржаўнап акадэміі мастацтваў, членаў Беларускага саюза мастакоў. Сярод удзельнікаў, узрост якіх не перавышае 31 года, — пераможцы рэспубліканскага конкурсу "Зорка ўзышла над Беларуссю", VI Адкрытых маладзёжных Дэльфійскіх гульяяў краін — удзельніц СНД, міжнародных мастанкіх спаборніцтваў.

Быстава дае магчымасць не толькі адкрыць новыя таленты, але і паназіраць за развіццём тых, хто раней 6ыў адзначаны спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ